3. *Товстоногов Г.А.* Круг мыслей: Статьи. Режиссерские комментарии. Записи репетиций. — Л., 1972. — С. 8.

4. Цит. по: Фрейдкина Л.Н. Дни и годы В.И.Немировича-Данченко: Летопись жизни и творчества. — М., 1962. — С. 346.

Н.А.Куляшова,
*суіскальнік*

## КУЛЬТУРНА-ГІСТАРЫЧНЫЯ АБ'ЕКТЫ г. МІНСКА Ў ЭКСКУРСІЙНЫМ МЕНЕДЖМЕНЦЕ

Гонарам жыхароў Беларусі з'яўляецца яе сталіца горад-герой Мінск — буйнейшы палітычны, эканамічны, навуковы і культурны цэнтр. Яго месцазнаходжанне на перакрыжаванні чыгуначных, аўтамабільных і паветраных шляхоў аказала вялікі ўплыў на асаблівасці горадабудавання і архітэктуры. Акрамя таго, горад заўсёды быў месцам узаемадзеяння розных народаў і іх культур, перакрыжаваннем, на якім сутыкнуліся каталіцкі Захад і праваслаўная Русь, што таксама зрабіла свой адбітак на аблічча Мінска. Горад цікавы архітэктурай жылых і спартыўных пабудоў. За апошняе дзесяцігоддзе дасягнуты значныя поспехі ў паляпшэнні архітэктурна-мастацкага аблічча масавай пабудовы ў мікрараёнах. Умелае выкарыстанне прыроднага ландшафту, воднай прасторы і зялёнага масіву для размяшчэння архітэктурных дамінант надае непаўторную прыгажосць гораду. Цяжка пераацаніць таксама ролю манументаў, манументальнага жывапісу і скульптуры, малых архітэктурных формаў ва ўзмацненні мастацкай выразнасці аблічча нашай сталіцы. Асаблівая прыгажосць плошчаў уздоўж асноўнага сталічнага праспекта імя Францыска Скарыны. Пра багацце духоўнага жыцця горада сведчаць шматлікія музеі, тэатры, Палацы культуры, выставачныя залы і кінатэатры. Таму для сваіх грамадзян і для прыезджых Мінск — дзіўны і цікавы як аб'ект турыстычна-экскурсійнага менеджменту.

Да пачатку 90-х гг. турыстычна-экскурсійнае вытворчае аб'яднанне Мінсктурыст магло прапанаваць 120 найменняў турыстычна-экскурсійных маршрутаў. З надыходам эканамічнага крызісу 90-х гг. экскурсійная дзейнасць Мінсктурыста значна знізілася з-за змяншэння заказаў спажыўцоў. Цяпер са 120 найменняў экскурсійных маршрутаў функцыянуе толькі 25, таму

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

што астатні інфармацыйны матэрыял незапатрабаваны. У той жа час у выніку змянення палітычныга курсу краіны і пераасэнсавання жыццёвых арыенціраў ідэалагічная накіраванасць зместу экскурсійнага матэрыялу змянілася. І ў дадатак да ўсяго за апошнія пяць гадоў з'явілася многа новых твораў архітэктуры і скульптурных кампазіцый, якія неабходна асвойваць як экскурсійныя аб'екты. Такім чынам, у экскурсійнай дзейнасці наступіла пераломная пара, калі якасць работы павінна быць узнята на больш высокі прафесійны ўзровень, каб прыцягнуць найбольшую колькасць экскурсантаў. Назавём некаторыя экскурсійныя аб'екты, што, на наш погляд, прадстаўляюць асаблівую цікавасць.

Прапануюцца наступныя варыянты абноўленых тэматычных экскурсій:

1. Храмы Мінска: шлях праз вякі. На прыкладзе адрэстаўраваных і новых культавых пабудоў сталіцы.

2. Дэкаратыўна-паркавая скульптура Мінска.

3. Мінскі метрапалітэн.

4. Па набярэжнай Свіслачы.

5. Плошча Незалежнасці.

6. Кастрычніцкая плошча як галоўны адміністрацыйны і культурна-асветніцкі цэнтр сталіцы.

7. Ландшафтная архітэктура ў кампазіцыі новых архітэктурных ансамбляў.

8. Літаратурны Мінск і інш.

Пералічаныя экскурсіі могуць быць аўтобусна-пешаходнымі і пешаходнымі. Трэба сказаць, што ў цяперашні час турыстычна-экскурсійнае вытворчае аб'яднанне Мінсктурыст даволі часта прапануе пешаходныя экскурсіі, асабліва для школьнікаў, таму што яны больш даступныя па цане і менш працяглыя па часе. Ужо цяпер можна прапанаваць абноўленыя пешаходныя экскурсіі па цэнтральных плошчах — Кастрычніцкай і плошчы Незалежнасці, дзе, як мы ўжо ўпаміналі, з'явілася многа культурна-гістарычных аб'ектаў, якія немагчыма пабачыць праз вокны турыстычнага аўтобуса. На плошчы Незалежнасці і ў прылягаючых да яе скверах размешчаны розныя значымыя для паказу экскурсантам аб'екты, якія нясуць розныя сацыякультурныя функцыі. Напрыклад, касцёл святых Сымона і Алены пачаў функцыянаваць як культавая пабудова ў 1990 г. У савецкі час ён быў аб'ектам грамадзянскага значэння. З 1993 г. касцёл стаў цэнтрам каталіцкай духоўна-маральнай і культурна-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

выхаваўчай работы. Там праходзяць спектаклі, канцэрты, наладжваюцца выставы. Працуюць два тэатры, дзяцячы "Анёл" і дарослы — "Зніч", а таксама бібліятэка і нядзельная школа. Пабудаваны Чырвоны касцёл у 1906—1910 гг. па праекце Тамаша Пайздзерскага. У дэкаратыўным афармленні храма і яго аб'ёмнай кампазіцыі ў асноўным выкарыстаны матывы раманскай архітэктуры з некаторымі дэталямі і прыёмамі готыкі. Велічныя формы, ураўнаважанасць, спакойная моц, цёмна-чырвоная фігурная цэгла аказваюць вялікае эмацыянальнае ўздзеянне на экскурсантаў. Побач з касцёлам знаходзіцца хрысціянскі каталіцкі сімвал — скульптура "Архангел Міхаіл, які звяргае Злога". Архангел Міхаіл з'яўляецца ў каталіцкім свеце заступнікам Беларусі. Аўтар гэтай скульптуры — малады беларускі скульптар Ігар Голубеў. Справа ад касцёла размешчана скульптурная кампазіцыя "Фантан" знакамітага беларускага майстра Анатоля Анікейчыка. Халаднаватая гладзь вадаёма, выгнчаныя фігуры юнака і дзяўчыны, якія пералліваюць ваду з адной пасудзіны ў другую, пяшчота і тонкая грацыя гэтых статуй здымаюць духоўную напружанасць ад прагляду Чырвонага касцёла.

Увогуле касцёл і былыя даходныя дамы пачатку XX ст., якія знаходзяцца побач, утвараюць маляўнічы архітэктурны ансамбль, што ўдала гармануе з ансамблем плошчы Незалежнасці.

Патрыятычныя пачуцці выклікае мемарыяльны знак у памяць аб загінуўшым у гады Вялікай Айчыннай вайны падпольшчыку У.Амельянюку.

Пачуццё нацыянальнай гордасці ахоплівае экскурсантаў, калі яны бачаць скульптуры вялікіх беларускіх асветнікаў XVI ст. М.Гусоўскага, Ефрасінні Полацкай, Ф.Скарыны, якія ўстаноўлены ў 1998—2000 гг. у скверы БДУ. Над помнікам Ф.Скарыне працаваў скульптар Сяргей Адашкевіч; М.Гусоўскаму — Уладзімір Панцялееў; Ефрасінні Полацкай — Ігар Голубеў. Усе буйнейшыя універсітэты Еўропы па традыцыі ўзводзілі помнікі знакамітым людзям, таму сам факт узвядзення гэтых помнікаў як бы далучыў БДУ да ліку еўрапейскіх універсітэтаў. Плануецца ўстанавіць ва універсітэцкім дворыку помнік Васілю Цяпінскаму, а таксама тым выдатным вучоным Беларусі, якія працавалі ў БДУ і прынеслі яму славу: першаму рэктару Уладзіміру Пічэту, географу Аркадзю Смолічу, гісторыку Мітрафану Доўнар-Запольскаму, першаму прэзідэнту АН БССР прафесару БДУ Усеваладу Ігнатоўскаму і інш.

Аповед аб выдатных асветніках цікавы экскурсантам для набыцця ведаў па гісторыі Беларусі і яе культуры.

Прадугледжаны пры пешаходных экскурсіях і кароткачасовы адпачынак. У дадзеным выпадку гэта прыпынак у Міхайлаўскім скверы на вуглу вуліц Ленінградскай і Свярдлова, дзе экскурсанты могуць палюбавацца чароўнай дэкаратыўна-паркавай скульптурай "Незнаёмка" скульптура Ул.Жбанава (1998). На бронзавай лаве сядзіць грацыёзная дзяўчына, падобная да балерыну, якая быццам забегла ў сквер адпачыць пасля працяглых рэпетыцый. Скульптура выканана з бронзы ў чалавечы рост, таму здалёк, асабліва у прыцемкам, здаецца, што гэта жывы чалавек. Вытанчаная пластыка адлюстравання прымушае адчуць яе інтэлігентнасць, узнёсласць і прыгажосць.

Зацікавіць экскурсантаў яшчэ адна работа Уладзіміра Жбанава, якая ў ліпені 1999 г. упрыгожыла Міхайлаўскі сквер. Прататыпам для гэтай скульптуры з'явіўся беларускі акцёр і прадзюсер Уладзімір Галынскі, які трагічна загінуў у маі 1999 г., але ў памяць аб ім застаўся цікавы кінафільм і скульптурны вобраз яго галоўнага героя.

Але ўсё ж такі асноўнае архітэктурнае аблічча плошчы Незалежнасці ствараюць велічныя манументальныя будынкі дзвюх вядучых ВНУ рэспублікі (Беларускага дзяржаўнага універсітэта і Беларускага дзяржаўнага педагагічнага універсітэта імя М.Танка), будынкаў гарсавета, Упраўлення Мінскага метрапалітэна з гадзіннікам і флюгерам-зубрам. Самая ж значная пабудова на плошчы — гэта Дом урада з манументальнай скульптурай У.І.Леніна. Архітэктура будынка простая і лаканічная. Нягледзячы на халодны шэры колер і вялікія памеры, ён не здаецца цяжкім, груваскім. Архітэктар І.Г.Лангбард, праектуючы Дом урада (у 1929—1934 гг.), прадугледзеў стварэнне перад будынкам помніка Леніну, аўтарам якога з'яўляецца скульптар М.Манізер. Гэты помнік — высокамастацкі твор манументальнай архітэктуры 30-х гг. Помнік мае не толькі гістарычную каштоўнасць, але і эстэтычную як прыклад узвышанага мастацтва.

З плошчы Незалежнасці пачынаецца галоўная магістраль сталіцы — праспект Францыска Скарыны.

Не менш цікавай і змястоўнай можа быць пешаходная экскурсія ў раёне Кастрычніцкай плошчы. Многафункцыянальнасць плошчы дае ёй права быць адміністрацыйным і культурным цэнтрам сталіцы. Акрамя таго, што на плошчы за



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

апошнія гады з'явіліся новыя архітэктурныя пабудовы і скульптурныя кампазіцыі, у экскурсію могуць быць уключаны і тыя гісторыка-культурныя аб'екты ў раёне плошчы, пра якія немагчыма расказаць у аглядней гарадской экскурсіі і якія "застаюцца за кадрам". Плошча зручная для экскурсійнага абслугоўвання: дазваляецца стаянка аўтобусаў, а падземны пераход з'яўляецца звязуючым звяном плошчы з Цэнтральным скверам, дзе знаходзіцца Нацыянальны драматычны тэатр імя Я.Купалы. На плошчу прыходзяць настаўнікі са сваімі вучнямі наведаць Музей гісторыі Вялікай Айчыннай вайны і Музей ваеннай тэхнікі пад адкрытым небам. А закончыць урок патрыятычнага выхавання мэтазгодна з супрацьлеглага боку плошчы, дзе на п'едэстале стаіць танк — помнік танкістам, якія вызвалілі акупіраваны фашыстамі ў гады вайны горад. У рытуал экскурсіі ўваходзіць "мінута маўчання", якую экскурсанты праводзяць каля месца, дзе пакаралі смерцю мінскіх падпольшчыкаў у гады Вялікай Айчыннай вайны. Мемарыяльны знак, які ўстаноўлены ў 1979 г. на месцы гэтай трагічнай падзеі (скульптар А.Анікейчык, архітэктар Л.Левін), уяўляе гранітную пліту з калючым дротам і слядамі босых ног.

Будынкі Дома афіцэраў, Беларускага патрыятычнага саюза моладзі, Упраўлення справамі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь, аднаўленыя трыбуны з балюстрадамі, Музей гісторыі Вялікай Айчыннай вайны і Музей ваеннай тэхнікі фарміруюць у грамадзян пачуццё гордасці за сваю Радзіму, пачуццё патрыятызму.

3 ліпеня 1998 г. адбылося адкрыццё новай архітэктурнай кампазіцыі, якая атрымала назву "Нулявы кіламетр". Яна стала своеасаблівай кропкай адліку адлегласцей да гарадоў Беларусі і самых буйных цэнтраў Расіі. Кампазіцыя прадстаўляе сабой гранітную піраміду, увенчаную бронзавым наканечнікам, ад якога ўздоўж граней адыходзяць чатыры промні, што ўказваюць напрамкі свету. Бронзавы фундамент піраміды складаецца з трох прыступак, на якіх абазначаны гарады і адлегласць ад іх у кіламетрах. Гэтую архітэктурную кампазіцыю выканала фірма "Адменнае ліццё". Аўтары праекта — Армен Сардараў і Віктар Завядзееў.

У пачатку 2000 г. адкрыты Палац Рэспублікі. Архітэктурнае аблічча гэтага будынка адпавядае яго прызначэнню. Ён з'яўляецца кампазіцыйным цэнтрам плошчы і складае адзіны архітэктурны ансамбль з Музеем гісторыі Вялікай Айчыннай вайны, з Домам афіцэраў на супрацьлеглым баку праспекта і вуглавымі будынкамі

па вуліцы Энгельса. Параднасць і манументальнасць гэтых будынкаў змякчаюцца прыгажосцю і лёгкасцю Палаца прафсаюзаў, пабудаванага ў стылі неакласіцызму, скверам і абноўленым будынкам тэатра імя Янкі Купалы.

Цэнтральны сквер — любімае месца адпачынку мінчан. Гэта і месца кароткачасовага адпачынку турыстаў. На цэнтральнай алеі сквера знаходзіцца фантан з дэкаратыўна-паркавай скульптурай "Хлопчык з лебедзем". Фантан будзе поўнасцю рэканструявацца, і яму будзе вернуты яго першапачатковы выгляд. Адновяць у скверы і дэкаратыўныя вазы, якія зробяць гэты паркавы ансамбль яшчэ больш прывабным.

Вуліцу Энгельса можна было б перайменаваць у Тэатральны раз'езд, таму што на ёй знаходзяцца тры тэатры і кінатэатр. Гэта тэатр імя Янкі Купалы, кінатэатр "Піянер", там жа знаходзіцца Тэатр лялек, а крыху далей — будынак Тэатра юнага гледача. У архітэктурна-кампазіцыйным плане гэты тэатральны раз'езд пачынае "Алея зорак" — незвычайны архітэктурны ансамбль, адкрыты да Дня Перамогі 9 мая 1998 г. Архітэктар А.Шабалін выкарыстаў малыя архітэктурныя формы: шары-ліхтары, замацаваныя на стылізаваных пад рваны камень апорах, гранітныя паверхні, на якіх будуць выбіты прозвішчы знакамітых артыстаў тэатра імя Я.Купалы.

Ёсць у раёне Кастрычніцкай плошчы і яшчэ адзін аб'ект, які прадстаўляе культурна-гістарычную каштоўнасць. Гэта дом-музей Ваньковічаў, што знаходзіцца за Палацам Рэспублікі. У гэтым доме жыў Валенцій Ванькові́ч — знакаміты беларускі мастак, чые карціны ўпрыгожваюць многія музеі свету. Экспазіцыя дома-музея будзе знаёміць з культурай, мастацтвам і побытам мінчан пачатку XIX ст. У суседнім будынку вядуцца рэстаўрацыйныя работы, там плануецца размясціць музей рэдкай кнігі.

Дзякуючы рабоце нашых архітэктараў-горадабудаўнікоў, Кастрычнікая плошча з'яўляецца цудоўным архітэктурным ансамблем, якая дасць сапраўдную асалоду ўсім, хто пабывае на ёй.

Шматлікасць турыстычных аб'ектаў культурна-гістарычнага, эстэтычнага і патрыятычнага значэння, якія з'явіліся за апошнія тры-чатыры гады ў Мінску, — гэта вялізны патэнцыял унутранага турызму, аднак, каб гэты патэнцыял стаў рэальнай магчымасцю, неабходны адпаведныя ўмовы: трэба падрыхтаваць помнікі гісторыі і культуры для турыстычна-экскурсійнага



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

паказу, арганізаваць зручныя аўтастаянкі, пад'езды і падыходы да аб'ектаў экскурсій, стварыць спрыяльныя ўмовы для іх візуальнага ўспрымання. Неабходна распрацаваць канкрэтныя турыстычна-экскурсійныя маршруты з канцэнтрацыяй вакол іх аб'ектаў сферы аблугоўвання. Але для паспяховай эксплуатацыі новых экскурсійных аб'ектаў неабходна вырашыць шэраг канкрэтных праблем агульнага характару, якія ўзніклі ў цяперашні час у экскурсійным менеджменце. Пра гэта гаварылася ў красавіку 1999 г. у Пінску на семінары "Экскурсійны менеджмент і развіццё турыстычна-экскурсійных маршрутаў на сучасным этапе ў рэспубліцы".

Па-першае, адсутнічаюць метадычныя распрацоўкі экскурсій, якія ўключаюць новыя культурна-гістарычныя аб'екты. Па-другое, адчуваецца недахоп кваліфікаваных экскурсаводаў. Па-трэцяе, перасталі ўлічвацца ўзроставыя катэгорыі экскурсантаў. Не хапае сродкаў на рэкламу аглядных і пешаходных экскурсій у школах, а школьнікі з'яўляюцца галоўнымі суб'ектамі экскурсійнага абслугоўвання. Трэба сказаць і пра тое, што многія школы не праяўляюць вялікай зацікаўленасці ў заказе экскурсій.

Вельмі хочацца, каб падрастаючае пакаленне ўвайшло ў трэцяе тысячагоддзе ўзбагачанае ведамі аб культуры і гісторыі нашай Радзімы і яе сталіцы горада-героя Мінска.

**Т.М.Лапцэвіч,**
*аспірантка*

## РОЛЯ ДУХОЎНАЙ КУЛЬТУРЫ Ў ВЫРАШЭННІ ДЭМАГРАФІЧНЫХ ПРАБЛЕМ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

Канстатуючы наяўнасць у нашай краіне дэмаграфічнага крызісу, сучасныя айчынныя навукоўцы спрабуюць вырашыць гэтую праблему, прапанаваць шляхі выйсця з яе.

Вывучэннем дэмаграфічнага становішча ў цэлым і рэпрадукцыйнай функцыі сям'і ў прыватнасці займаецца дэмаграфія. Да апошняга часу гэтая навука традыцыйна амаль манапольна даследавала гэтую галіну. Часцей за ўсё даследаванні зводзіліся да фіксацыі статыстычных звестак. Рэпрадукцыйная сфера сям'і разглядалася дэмографамі як сістэма рэпрадукцыйна-дэмаграфічных паказчыкаў, якія змяняюцца. Рэпрадукцыйна-дэмаграфічныя паказчыкі цесна звязаны з рэпрадукцыйнай



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ